## ДОБРЫ ПАЧАТАК— ДОБРАЯ ПРЫКМЕТА

Амаль 950 студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта працуюць на ўборцы ўраджаю ў Чавускім раёне Магілёўскай вобласці. У першы тыдзень яны ў асноўным убіралі лён, працавалі на зернетаках, а зараз перайшлі да актыўнай уборкі бульбы.

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе асноўны цяжар арганізацыі працы і быту студэнтаў у час уборачных работ быў ускладзены на плечы камандзіраў і камісараў сельскагаспадарчых студэнцкіх атрадаў. І яны выдатна справіліся са сваімі абавязкамі. Добра працуе камандзір атрада другакурснікаў Людміла Санюк. Яна ўнікае ва ўсе падрабязнасці работы і жыцця свайго атрада. Мне вельмі спадабалася, з якой павагай аднасяльчане да яе калгаснікі. Люда кожную раніцу абавязкова прысутнічае на нарадзе ў старшыні калгаса «Камуніст», дзе працуе атрад, а потым сама размяркоўвае на працу байцоў.

У гэтым годзе ўпершыню на нашым факультэце камандзірамі сельгасатрадаў першакурснікаў былі назначаны студэнты старэйшых — чацвёртых і пятых курсаў. Гэта практыка апраўдала сябе. Камандзіры хутка і лёгка наладзілі кантакты з атрадамі, з ахвотай узяліся за работу. Цікава назіраць, як амаль на вачах мяняюцца, сталеюць людзі, калі на іх ускладаецца адказнасць. Сярод нашых былых «непрыкметных» старшакурснікаў выявіліся цікавыя, ініцыятыўныя арганізатары, сапраўдныя камандзіры працы. Гэта чацвёртакурснік Сяргей Дзюбкоў, які працуе з першакурснікамі-механікамі ў саўгасе «Галавенчыцы», пяцікурснікі Аляксандр Халімановіч і Сяргей Самаль, якія працуюць з атрадамі матэматыкаў 1 курса ў калгасах «Іскра» і «Маяк».

Вынікі працы падводзіць яшчэ рана, хоць адзначым, што студэнты нашы працуюць сумленна, імкнуцца выконваць і перавыконваць нормы. У вольны час не забываюць шэфскую і культмасавую работу. У мінулую суботу педагогі .3 курса выступілі з канцэртам перад працаўнікамі калгаса «Зара», а пяцікурснікі, якія працуюць на сушыльным заводзе ў г. Чавусы, афармляюць для завода стэнды. Такіх прыкладаў можна прывесці мноства.

Працоўны семестр студэнтаў-матэматыкаў паспяхова працягваецца.

Ул. ГАБРЫНОВІЧ,
старшы выкладчык механіка-матэматычнага факультэта, кіраўнік (ССГА).

## У восень—работ восем

Здаецца, нямнога часу прайшло з таго першага дня, калі з рукзакамі, авоськамі і саквояжамі мы высыпалі з машын каля сельскага клуба, дзе сустракалі нас сакратар партарганізацыі і дырэктар саўгаса «Макеевічы» Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Слова ўзяў дырэктар:

— Мы рады вас сустрэць у нашым саўгасе. Рабочых рук у час уборкі штогод не хапае. Цяпер у нас самая гарачая пара. Нездарма ж гавораць у народзе: у восень — работ восем. Так што — дапамагайце...

У нашым атрадзе 45 байцоў. Трэцюю студэнцкую восень мы сустракаем на ўборцы ўраджаю. Аб'екты работ розныя, раскіданы па навакольных вёсках—масавая ўборка бульбы яшчэ не пачалася. Так што сустракаемся разам толькі на ранішняй лінейцы. У першыя дні дзяўчаты ўбіралі лён. Наогул, у саўгасе лён убіраюць камбайны, але некаторыя ўчасткі давялося ўбіраць уручную. Работа была нязвыклая, даволі цяжкая. Пальчаткі, якімі запасліся дзяўчаты, былі парваны ў першы ж дзень. Доўга ніхто з нас не асмельваўся зацягнуць знаёмую з дзяцінства песню: «Ох, сэрца-лянок, мая радасць ты, лянок...»

Паступова прыходзіла ўменне. Вырашылі стварыць брыгаду па ўборцы льну. Яна апраўдала сябе. Люда Бусько, Люда Брыжэвіч, Зоя Яновіч, Лена Башун, Жана Пагарэлава і іншыя былі проста малайцамі. Больш чым па тры соткі льну выбралі яны за дзень. «Працуем з натхненнем,— гаварылі дзяўчаты.— Лён нам і ноччу сніцца...»

Да ўборкі бульбы ў саўгасе прыступілі пакуль яшчэ толькі два бульбаўборачныя камбайны. Працуюць на іх і нашы студэнты. Падабаецца вельмі. Пачуццё локця на канвееры неабходна. На 5—6 тон перавыконваюць механізатары дзённыя нормы. Ёсць у гэтым поспеху і заслуга нашых дзяўчат.

Загарэлыя, абветраныя, з мазолістымі рукамі вяртаюцца з поля нашы рабяты. У сталовай іх чакае духмяны наварысты боршч, свежы хлеб... Толькі і размоў пра сваю работу. Яны скірдуюць салому.

— Цяжка? — пытаем.

— А то як жа,— не без гонару адказваюць яны.

Акрамя таго, працуюць рабяты ў майстэрні, на закладцы сенажу. А Толя Латоцін — нават на ільнаўборачным камбайне.

А з якім захапленнем расказвае пра работу ў начную змену на зернетаках Аня Малахоўская:

— Вось дзе адчуваецца сапраўдная праца! Здаецца, што вось-вось стома зваліць і рукі не ўтрымаюць рыдлёўку, але зірнеш на дзяўчат — трымаюцца малайцамі, усміхаюцца. І сілы паяўляюцца. Вяртаешся дадому — стома валіць з ног. Але ў душы кожны бязмежна шчаслівы і задаволены. Такую задаволенасць можа прынесці толькі праца.

...У канцы першага тыдня падводзілі вынікі: ля штаба сабраліся на лінейку. Прысутнічаў і дырэктар саўгаса. Пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва ўзнялі атрадны сцяг.

— Што і казаць,— задаволена гаворыць дырэктар,— малайцы, адным словам. Выдатна працуеце. Так трымаць!

Цікава жыве наш атрад. Не змаўкаюць песні да паўночы ў штабе: агітбрыгада рыхтуе канцэрт. Вынікі працоўнага дня адзначае рэдкалегія — кладуцца радкі ў «баявы лісток»: «Сёння ўбрана бульбы — 25 тон, застагавана саломы...»

Т. МАНЁНАК,
баец ССГА «Тайфун»,
в. Макеевічы Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

# ЮБІЛЕЙНАМУ ГОДУ—



### ФОТАРЭПАРТАЖ

## ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР ПРАЦЯГВАЕЦЦА



Студэнтаў БДУ можна сустрэць зараз у многіх гаспадарках рэспублікі. Ідзе ўборка другога хлеба.

Калгас «Герой працы» Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці — месца дыслакацыі студэнцкага сельскагаспадарчага атрада факультэта журналістыкі.

Патрыёт сваёй вобласці, Валера Маскалёў запэўніваў таварышаў, што на час уборкі бульбы надвор'е будзе «ну проста дым».

Добры ты хлопец, Валера. Але ж і надвор'е на Магілёўшчыне! Дождж — праз дзень. А то і кожны дзень. І вось у такіх складаных умовах прыйшлося працаваць студэнтам.

Першыя дні мы працавалі ў садзе.

— Ну, крыху прывыклі? — спытаў нас старшыня калгаса А. Ф. Бекасаў. — Заўтра на бульбу.

Першыя бліны, вядома, заўсёды камяком. Выдаць норму з нязвычкі было цяжкавата, але ўжо праз некалькі дзён атрад перавыканаў яе на 30 працэнтаў. А яшчэ праз дзень у сталовай паявіўся «баявы лісток»: «Ёсць 164 працэнты нормы!» Гэта была перамога. У чым жа сакрэт поспеху?





# КРЫЖЫКІ—НУЛІКІ...

А пачалося ўсё з таго, што дзяўчаты нашага атрада наладзілі сувязь з Дзямідавіцкай пачатковай школай. Навялі вакол школы ўзорны парадак, адрамантавалі дзіцячую пляцоўку. А Надзя Бычкова і Люба Ашурка афармілі стэнды: «Правілы для навучэнцаў пачатковай школы». Здзіўляешся дзяўчатам: нібыта і стома іх не кранае. Пасля напружанага працоўнага дня толькі падвернецца вольная хвіліна — яны ў школе. Спачатку прыходзілі і арганізоўвалі усемагчымыя матэматычныя гульні, развучвалі з дзецьмі песні. Вечарамі школу стала наведваць усё больш вучняў, і ў атрадзе вырашылі: «Адкрыем школьны лагер»! І адкрылі. Назву прыдумалі. Цяпер «Спадарожнік» стаў месцам правядзення вольнага часу вучняў. З Іванскай васьмігодкі нават зачасцілі сюды. Васьмігодка, трэба адзначыць, размяшчаецца няблізка, каля трох кіламетраў ад нашай вёскі. І камандзір атрада Віктар Ланько прапанаваў правесці матэматычны бой у Іванскай школе. Ала Стаблецкая і Іра Калягіна у мясцовай бібліятэцы падабралі з матэматычных часопісаў кожнай камандзе дзесяць цікавых задач, разлічаных на кемлівасць.

...Заціхае перапоўненая зала. На матэматычнае спаборніцтва старшакласнікаў прыйшло шмат балельшчыкаў. З цікавасцю назіраюць дарослыя: «Ат жа, студэнты! І прыдумаюць — матбой!».

Сур'ёзным і недаступным здаецца журы, у якое ўваходзяць, акрамя настаўнікаў, нашы атрадаўцы.

Ала Стаблецкая знаёміць удзельнікаў з умовамі гульні. Яна вядучая сённяшняга турніру.

На дошцы ўмова адной задачы змяняецца другой. Задачы патрабуюць уважлівасці, добрага лагічнага мыслення. Напружана цягнецца час. Над аркушам паперы схіліліся капітаны. Як мага хутчэй неабходна паставіць на адной прамой пяць крыжыкаў ці нулікаў. А вось і апошні крыжык.

Пад апладысменты прысутных журы аб'яўляе каманду-пераможцу. Усе удзельнікі турніру запрашаюцца на заключны вечар нашага атрада.

**І. РУБЕНЧЫК,**
баец сельгасатрада «Салярыс».

# «Салярыс»

## (НАТАТКІ ПАСЛЯ КАМАНДЗІРОЎКІ)

**«Адзначаем высокую арганізаванасць працы, быту, выдатную культурна-масавую і грамадска-палітычную работу сельгасатрада «Салярыс». На наш погляд, гэта лепшы на дадзены момант сельгасатрад у Чашніцкім раёне».**
**Гэты запіс зроблены ў дзённіку атрада. Яго пакінулі, наведаўшы «Салярыс», намеснік дэкана ФПМ Віктар Іванавіч Карзюк, дацэнт А. Ф. Навумовіч, сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў ФПМ дацэнт М. М. Фядзеня.**

У апошнія дні надвор'е выкідвала такія зігзагі-парабалы, што заставалася толькі развесці рукамі. Як з апрастанай бочкі, ліў восеньскі халодны дождж, пасля якога сцякалі каламутныя ручаіны дажджавой вады, а ў полі прыбуксоўвалі трактары.

Пад ботамі чвякала кашыцай зямля, рабіліся непаслухмянымі настылыя пальцы. Хацелася кінуць гэты апрыклы палетак, гэту намытую да жаўцізны і такую халодную бульбу і падсесці да вогнішча і грэць, грэць рукі, ні пра што не разважаючы. Віктар Ланько, камандзір сельгасатрада «Салярыс», украдкай ад сяброў, нібы баючыся, што гэтым самым здрадзіць, зірнуў у бок вогнішча. Іменна так паступілі там, адкуль зманліва цягнула дымком. Ля полымя таўклася група тэатралаў, дакладней, студэнтаў тэатральнага інстытута. Там смяяліся, жартавалі, не абышлося без зларадства і над імі — ідэйнымі, так «ахрысцілі» «салярысцаў» тэатралы. Ахрысцілі за высокія паказчыкі выпрацовак, за тое, што ў атрадзе «Салярыс» добра ўсведамляюць часовае прызначэнне ў калгасе імя Жданава.

Шмат спраў у гаспадарцы, але галоўная з іх і якраз самая працаёмкая — гэта ўборка бульбы. «Другі хлеб» займае ў калгасе 100 гектараў. Як вядома, ураджай патрабуе своечасовай і якаснай уборкі, рабочых рук, якіх так не стае.

Віктар быў упэўнен, што ні праз дзесяць, ні праз сотню крокаў ніхто ў атрадзе не выпрастае спіны, каб, зірнуўшы на дымок, сказаць: «Досыць з мяне! Што, я не такі, як яны?» І таму, чамусьці, цяплелі пальцы, лягчэй працавалася.

Праходзіць некалькі дзесяткаў мінут, і з бульбянога палетка да месца буртоўкі адпраўляецца чарговы трактар з прычэпам, даверху загружаным важкімі клубнямі.

Ужо больш тыдня, як «Салярыс» падбірае клубні. Працуе сумленна і старанна: кожны баец атрада за дзень падбірае за бульбакапалкай каля 1000 кг клубняў. А да гэтага байцы дапамаглі калгасу звезці салому з поля, хадзілі на ток прасушваць збожжа.

Што сабой уяўляе «Салярыс»? Іх — трыццаць пяць. Асноўны кантынгент — дзяўчаты. Усё гэта рознахарактарнае насельніцтва атрада аб'ядноўвае агульнае: імкненне быць карысным грамадству. Сельгасатрад «Салярыс» трэці год працуе на бульбе, дарэчы, у адной і той жа вобласці — Віцебскай і амаль што былым сваім саставам. За мінулую бульбу «Салярыс» быў прэміраван паездкай у Вільнюс.

Камісар атрада Люба Дударчык і камандзір Віктар Ланько, байцы І. Русецкі, І. Рубенчык, вярнуўшыся з будатрадаў, як сапраўдныя ветэраны «Салярыса», адмовіліся ад адпачынку, дабіліся дазволу на перанос практыкі і падаліся на бульбу. У «Салярыса», як кажуць самі байцы, ёсць сэрца — камандзір і душа — камісар; ёсць нястомны гітарыст Іосіф Рубенчык — апора і надзейнае плячо камандзіра.

З першых дзён байцы «Салярыса» ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокія тэмпы і выдатную якасць. Каб спаборніцтва было больш дзейсным, у атрадзе падводзяцца вынікі работы, адзначаюцца лепшыя, указваецца на недахопы, плануецца работа на заўтра. Зразумела, што бульбяныя рады — розныя. І таму атрад працуе па прынцыпу ўзаемадапамогі: выйшаў уперад — дапамажы адстаючаму.

А. Ф. Таўгень, начальнік вытворчага ўчастка, на якім працуе «Салярыс», адзначае арганізаванасць, працавітасць, высокую якасць работы студэнтаў атрада.

Кожны новы дзень «Салярыса» насычан новымі здзяйсненнямі, новымі здабыткамі. Нядаўна на атрадным сходзе, параіўшыся, «Салярыс» прыняў новыя, больш высокія абавязацельствы: да 1 кастрычніка кожнаму студэнту групы накапаць не менш як 18 тон бульбы, дабіцца, каб у зямлі на ўбраных участках не засталося ніводнага клубня.

Расказваючы пра справы атрада, Віктар Ланько папрасіў:

— Калі будзеце адзначаць лепшых, то так і напішыце: усе, без выключэння, 35.

А гэта словы Іосіфа Рубенчыка:

— Кожны відзён, як на далоні. Выкладваюцца байцы да апошняга. Гэта, відаць, дае мне, і не толькі мне, запал, штуршок для чарговага працоўнага дня.

Не адной работай жыве «Салярыс». У вольны час лектары, удзельнікі мастацкай самадзейнасці рыхтуюцца да выступленняў, якія хутка адбудуцца перад мясцовымі хлеборобамі.

«І ўсё ж такі, — скажаце вы, — а што такое «Салярыс»?

«Салярыс» — гэта і мара, і вера, цяга да подзвігу, вялікія планы на будучыню. Гэта — планета сяброў, існуе яна на ФПМ.

**М. КУРГАНСКІ.**

# НАША ЎДАРНАЯ ПРАЦА!

— Ураджай добры. І працавалі дружна, — адказвае камандзір атрада Валодзя Прачуханаў.

Адна за другой напаўняюцца машыны адборнай бульбай. Усе працуюць старанна. Перадавікі — Галя Грэль, Іра Гусько, Марына Дабжынская, Вольга Шкала — у асобныя дні выбіраюць па 1.000 кг клубняў.

Добрую памяць пакінуць пасля сябе студэнты. Яны ўбралі яблыкі ў калгасным садзе, капаюць бульбу, працуюць на калгасным таку. Задаволены работай шэфаў калгаснікі, кіраўніцтва. Задаволены і самі студэнты. Бо вынікі працы добрыя і не радаваць не могуць.

**М. ДУБОВІК.**








**НА ЗДЫМКАХ:** на бульбяным полі калгаса «Герой працы»; першыя крокі па магілёўскай зямлі; спорыцца работа ў дзявочых руках; на калгасным таку — апошнія цэнтнеры збожжа; у калгасе наладжана механізаваная ўборка клубняў; адзін з нумароў канцэрта агітбрыгады; у вольны час можна адпачыць з вудачкай на рэчцы.

Фота аўтара і В. Маскалёва.

# Ля вёскі Чарнушкі

Жорсткія ішлі тут баі. Яшчэ і зараз не-не ды і выгляне з высокай травы пражаўлены стабілізатар міны, абломак авіябомбы. Студэнты збіраюць асколкі вайны, каб яны не палохалі людзей. Студэнты ачышчаюць святое месца. Тут, ля вёскі Чарнушкі, здзейсніў свой подзвіг Герой Савецкага Саюза Аляксандр Матросаў.

Зараз, у год 60-годдзя ВЛКСМ, зводны камуністычны атрад імя А. Матросава будуе на гэтым месцы мемарыял. У атрадзе студэнты БДУ імя У. І. Леніна, пскоўскіх політэхнічнага і педагагічнага, Вялікалукскага сельскагаспадарчага інстытутаў. Добраахвотнікі без разважанняў змянілі адрасы студэнцкага лета, каб стаць у строй камуністычнага СБА. Юрый Пазняк павінен быў ехаць на практыку ў Балгарыю, Віктар Войтаў — камандаваць уборачна-транспартным атрадам. Ва ўсіх былі свае планы. А яны сабраліся ля вёскі Чарнушкі. Чаму? Студэнт мехмата БДУ Аркадзь Ненартовіч адказаў так: «Што прымусіла мяне ехаць у камуністычны атрад? Хутчэй за ўсё патрэба аддаць даніну памяці ўсім удзельнікам вайны, героям, загінуўшым за вызваленне Радзімы, доўг унесці часцінку сваёй працы ва ўвекавечанне іх подзвігаў».

Грамадзянскасць пазіцыі байцоў СБА імя А. Матросава асабліва ярка раскрывае іх характары, іх лепшыя якасці. Рабяты сувымяраюць чысціню сваіх імкненняў з жыццём героя, цану сваёй працы ставяць у прамую залежнасць ад подзвігу юнага салдата Вялікай Айчыннай.

Марына Нікульшына, студэнтка Белдзяржуніверсітэта, сказала мне: «Я ніколі не думала, што маё баявое хрышчэнне ў СБА будзе такім незвычайным. Спачатку мяне пакарыла гучнасць назвы: «камуністычны атрад»! Цяпер я зразумела, што побач са мной працуюць моцныя, прыгожыя душой людзі...»

Ёсць у калектыве матросаўцаў два чалавекі, якім у многім абавязан атрад сваёй дружбай. Гэта камісар і камандзір. Мікалай Сцяпанаў — студэнт факультэта механізацыі Вялікалукскага сельгасінстытута, вопытны будатрадавец, які паспеў папрацаваць лінейным камандзірам, галоўным інжынерам і камісарам занальнага штаба. Бадай, самая галоўная вартасць камісара ў тым, што ён усё ўмее рабіць. Вадзіць машыну, кіраваць трактарам, зварваць метал, працаваць сякерай і рыдлёўкай. І пры ўсім гэтым сціпласць, часам нават сарамлівасць, ні намёку на паказуху.

Камандзір атрада, камуніст Аляксандр Казулін, вучыцца на мехмаце БДУ. У семестры-77 узначальваў СБА «Волаты» — адзін з лепшых у Мінскай вобласці. Ён, як гавораць, на будоўлі дырыжор. Адшукае любую магчымасць дастаць неабходныя матэрыялы, пераадолее ўсе цяжкасці, каб прыйсці да практычнага рашэння пытання. У характары Аляксандра цудоўна спалучаюцца чуласць, уважлівасць да сваіх таварышаў, напорыстасць у дасягненні мэты, непрымірымасць да паўмер у рашэнні праблем будоўлі. Ён працуе ўпэўнена, з размахам. «Большай прасторы для душы я не ведаю», — падвёў Аляксандр вынік нашай размове аб будатрадаўскім руху і аб яго асабістым месцы ў СБА.

Камуністычны СБА імя А. Матросава—на ганаровым працоўным маршы. Ён рыхтуе велічны падарунак юбілею Ленінскага камсамола.

Байцы гавораць, што па начах ім сніцца стэла, якая імкнецца ў неба, увенчаная залатой зоркай. Калі яны пабудуюць мемарыял, стэла гэта здалёк будзе ўказваць людзям шлях да месца подзвігу.

**А. СЛУКА,**
**камандзір Новаржэўскага занальнага СБА.**
Пскоўская вобласць.

# Прыступка да сталасці



**Прайшло, адгрымела студэнцкае лета. Ціхімі верасне́ўскімі вечарамі не-не ды і ўспамінаюцца вясёлыя і напружаныя дні, калі толькі слова «трэба» гаспадарыла на нашай будоўлі, дні ударнай працы.**

**Вось толькі адзін з іх, не падобны на іншыя і адначасова характэрны для нашага будатрадаўскага жыцця.**

**...Марудна выкатваецца сонца з пазалочаных яловых вяршынь. Голас дзяжурнага абуджае ранішнюю цішыню. Юнакі і дзяўчаты спяшаюцца на зарадку, а праз некалькі хвілін ужо ў «поўнай баявой» стаяць на лінейцы. Палымнее на флагштоку сцяг, узняты ў гонар брыгады Міколы Емельяновіча. З лінейкі пачынаецца працоўны дзень будатрада юрфакаўцаў БДУ «Белая Русь». Камандзір Пеця Лістраценка размяркоўвае людзей, дае кожнаму заданне на сённяшні дзень. Брыгада Віці Варанковіча пракладзе яшчэ некалькі дзесяткаў метраў дарогі. А брыгада Валерыя Ждана будзе пракладваць трубы пад тэлефонны кабель. Але гэта пазней. А пакуль што ўсе спяшаюцца ў сталовую. Смачным снеданнем кормяць сёння байцоў повары Жэня Скудная, Галя Буката і Зіна Саўчук, і, як заўсёды, дзяўчаты атрымліваюць шчырае «дзякуй» ад усіх будатрадаўцаў.**

**...Падыходзіць машына, і мы — на сваёй дарозе. Тут адразу адчуваецца напружаны рытм ударнай будоўлі. Пакуль Пеця Макадот і Саня Сцепанчук раўняюць дарожнае палатно, Віктар Камароўскі і яшчэ некалькі чалавек рыхтуюць сухую падсыпку пад пліты, прывозяць яе на аб'ект. Тым часам падыходзяць машыны з трохтоннымі плітамі. На іх разгрузцы працуюць страпальшчыкі В. Івалгін і В. Куцуха. Потым кран пераязджае на ўкладку пліт.**

**Тым часам на пракладцы труб засыпку і выроўніванне робіць брыгада В. Ждана. Праз некалькі дзён — тэрмін здачы аб'екта. З вышэйшай адзнакай імкнуцца здаць сваю работу будатрадаўцы — каб ад заказчыка не было ніякіх нараканняў.**

**А вечарам, калі заціхае лагер, яшчэ доўга гарыць святло ў вокнах вагончыкаў. Чуецца ціхая песня — Валодзя Пархоменка і Велера Ждан настройваюць гітары, рыхтуюцца да апошняга ў працоўным семестры канцэрта мастацкай самадзейнасці. Усміхаюцца сваім думкам, нахіліўшыся над сталом, А. Гапоненка і М. Емельяновіч — іх пісем чакаюць у Мазыры і Мінску, Бранску і Гомелі. А назаўтра ім зноў будуць зайздросціць таварышы, убачыўшы ў руках аднакурснікаў паўдзесятка рознакаляровых канвертаў.**

**Аматары кіно глядзяць новы мастацкі фільм у Ленінскім пакоі. Атрадны мастак В. Пархоменка заканчвае спецыяльны выпуск фотагазеты. В. Макарук і М. Дзячкоў вяртаюцца з бібліятэкі.**

**Канчаецца наша студэнцкае лета. Ужо падведзены папярэднія вынікі нашай працы і ўдзелу ў грамадскім жыцці. А яны значныя. Атрад за семестр асвоіў 175 тысяч рублёў капіталаўкладанняў замест 50 па дагавору. Мы прынялі ўдзел у праўдзенні аперацыі «Памяць», аформілі альбом з запісамі ўспамінаў мясцовых удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, прачыталі лекцыі, далі канцэрты мастацкай самадзейнасці, правялі спартыўныя спаборніцтвы.**

**Трэці працоўны стаў для нас добрай школай працоўнага майстэрства. Кожны дзень быў новай прыступкай да сталасці.**

**М. БАЖКО,**
**баец будатрада «Белая Русь».**




# І Ў НАС БЫЎ ФЕСТЫВАЛЬ

Раніцай 30 ліпеня стадыён у гарадскім пасёлку Бежаніцы напоўніўся смехам, весеѓлем, звонам гітар і песень. На раённы фестываль СБА сабраліся атрады з БДУ імя У. І. Леніна «Полымя», «Маладосць» і атрад імя Міхаіла Мароза, а таксама «Сузор'е» з БПІ і «Рытм» з ПДПІ.

У 11 гадзін на зялёным полі сталі ў рад калоны будатрадаўцаў. Ва ўрачыстай цішыні павольна праплыў сцяг фестывалю. Шмат цёплых слоў было сказана ў адрас байцоў СБА другім сакратаром РК ВЛКСМ А. Уласавым, які адкрыў мітынг дружбы.

У праграму фестывалю, прысвечанага 60-годдзю ВЛКСМ, уваходзілі конкурс агітбрыгад, спартыўныя спаборніцтвы і вечар адпачынку.

Першымі на сцэну выйшлі агітбрыгады СБА «Маладосць» і атрада імя Міхаіла Мароза. Мовай жартаў і песень рабяты расказалі аб сваім будатрадаўскім жыцці. Іх тэму прадоўжыла агітбрыгада СБА «Сузор'е». Фестывалю ў Гаване была прысвечана праграма агітбрыгады «Рытм». Клятвай салідарнасці з удзельнікамі Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў гучалі словы: «Калі мы адзіныя — мы непераможныя!».

— Добры дзень, славутая пскоўская зямля! Зямля, дзе кожны камень, кожная сцежка — гэта легенда, гэта частка гісторыі нашай вялікай Радзімы. Зямля, якая дала свету Пушкіна, зямля, дзе здзейсніў бяспрыкладны подзвіг Аляксандр Матросаў. Нізкі паклон табе ад сінявокай Беларусі, — так пачала сваё выступленне агітбрыгада СБА «Полымя». Адкрывала канцэртную праграму літаратурна-музычная кампазіцыя «Ён не вярнуўся з бою», прысвечаная тым, чый апошні крок абарвала варожая куля... Стадыён заціх. Усе напружана слухалі расказ аб гераічных днях:

Только грозная
доблесть их
Поселилась в сердцах
людских...

Непрыкметна пралятае час, і вось наступае ўрачыстая мінута: журы падводзіць вынікі. Першае месца аднадушна прысуджаецца агітбрыгадзе СБА «Полымя». Цяжка перадаць нашу радасць.

Закончылася праграма фестывалю футбольным турнірам, у якім перамаглі спартсмены СБА «Сузор'е».

**В. МАЛАФЕЕЎ,**
**баец СБА «Полымя»,**
**студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі.**
Бежаніцкі раён,
Пскоўская вобласць.

# ТЭЛЕГРАМА Ў НУМАР

**Рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта**

22 ліпеня 1978 года ў в. Карамышава Пскоўскага раёна Пскоўскай вобласці адбыўся пажар у Доме культуры. Першымі да месца здарэння прыбылі байцы студэнцкага будаўнічага атрада «Маладосць» хімічнага факультэта БДУ, якія вялі будаўніцтва жывёлагадоўчага комплексу ў Пскоўскім раёне. Студэнты правільна ацанілі абставіны, умела размеркавалі сілы. Дзякуючы іх смелым і рашучым дзеянням пажар, які пачынаў прымаць буйныя размеры, быў ліквідаван, былі выратаваны матэрыяльныя каштоўнасці на буйную суму.

Найбольш смела і рашуча дзейнічалі на пажары студэнты М. Валюкевіч, С. Дзенісевіч, А. Рошчын, А. Грышын, П. Панкрат, Д. Рубінаў.

Ад усёй душы выражаем удзячнасць вашым студэнтам.

**Начальнік АУС Пскоўскага райвыканкома, падпалкоўнік міліцыі ГУСЕЎ.**

# Веснік універсітэта

Працягваецца падпіска на навукова-тэарэтычны часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна». Выходзіць ён у чатырох серыях, на кожную з якіх можна падпісацца асобна.

Першая серыя ўключае як арыгінальныя, так і агляднныя артыкулы па пытаннях матэматыкі, фізікі і механікі.

Для біёлагаў, хімікаў, геолагаў і географаў, безумоўна, уяўляе вялікую цікавасць серыя, якая асвятляе распрацоўку тэм гэтых напрамкаў навукі і практыкі.

Для тых, хто цікавіцца актуальнымі праблемамі грамадскіх навук, прызначаецца трэцяя серыя. У ёй пяць асноўных раздзелаў: гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, права.

Чацвёртая серыя — адзінае ў Беларусі перыядычнае выданне па пытаннях літаратуразнаўства, мовазнаўства, журналістыкі, педагогікі і псіхалогіі. Рэдкалегія сістэматычна знаёміць чытачоў з важнейшымі навуковымі дасягненнямі беларускіх літаратуразнаўцаў, крытыкаў, лінгвістаў, журналістаў і псіхолагаў.

Кожная серыя выходзіць тры разы ў год. Цана нумара — 80 капеек.

Як набыць часопіс старэйшай ВНУ рэспублікі? Па падпісцы. Яна прымаецца без абмежавання ўсімі аддзяленнямі сувязі і грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

Часопіс у рознічны продаж не паступае.




**Народны тэатр БДУ аб'яўляе набор у творчы састаў тэатра.**

**Заявы падаваць у праўленне клуба (геафак, п. 4-а).**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 1372. Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ АТ 03524